ПРАЕКТ «ЛЮБАНШЧЫНА ПАРТЫЗАНСКАЯ»

# Эскадрон разведчыкаў лятучых...

**У кастрычніку 1943 года на падставе загада штаба партызанскага злучэння Мінскай вобласці была створана партызанская брыгада №121 імя Аляксея Брагіна – сакратара Мінскага падпольнага абкама КП(б) Б, які загінуў у верасні 1941 г. Ядром брыгады стаў атрад імя Мікалая Гастэлы.**

Увогуле ў 1943 г., акрамя вышэйназванай, былі створаны яшчэ тры партызанскія брыгады: у сакавіку – №100 імя Сяргея Кірава, у чэрвені – №101 імя Аляксандра Неўскага, у снежні – №258 імя Валерыяна Куйбышава. Такім чынам, колькасць партызанскіх брыгад, якія дыслацыраваліся і дзейнічалі ў Любанскім раёне, а таксама ў суседніх з ім, дасягнула шасці. На момант злучэння з часцямі Чырвонай арміі ў іх налічвалася звыш шасці тысяч байцоў.

Але вернемся да брыгады імя А. Брагіна. Камандзірам яе прызначылі Казіміра Пушчына, камісарам – Васіля Якіменку, начальнікам штаба – Міхаіла Шардыку. У брыгаду ўвайшлі атрады імя М. Гастэлы, Дзяніса Давыдава, Івана Сыцько, Канстанціна Заслонава, Івана Панфілава і кавалерыйскі эскадрон імя Льва Даватара.

«Давыдаўцамі» сталі, у асноўным, жыхары Малых і Вялікіх Гарадзяцічаў: Ігнат Ахрамейка, кулямётчык атрада, які на сваім рахунку меў больш за сем дзясяткаў забітых і параненых гітлераўцаў, Рыгор Ахрамейка, Васіль Бубіч, Рыгор Бубіч, Іван Перапёлкін, Іван Чэркас і іншыя. Атрад узначаліў Уладзімір Хамко – кадравы вайсковец, які напярэдадні Вялікай Айчыннай скончыў Магілёўскае пяхотнае вучылішча. Восенню 1941 г. трапіў у акружэнне, далучыўся да партызанскага руху ў кастрычніку 1941 г.

Камандзірам атрада імя І. Сыцько прызначылі Пятра Кукарэку – выпускніка Мінскага ваенна-пяхотнага вучылішча імя Міхаіла Калініна. Восенню 1942 г., пасля выканання спецыяльнага задання штаба партызанскага злучэння Мінскай вобласці, партызанская група пад яго камандаваннем улілася ў атрад імя М. Гастэлы.

Сярод «сыцькоўцаў» было нямала жыхароў Любаншчыны. Гэта Уладзімір Барысевіч, Яўген Бандарэнка, Аляксандр Чыркоўскі і Аляксандр Аскірка (кулямётчык) са Старасека, Аляксандр Лапцік і Фёдар Бедзік з Жалаў (акрамя ўдзелу ў баявых аперацыях, займаўся вырабам партызанскіх ручных гранат), Сямён Глаз з Загалля (камандзір аддзялення), Пётр Корзун з Татаркі, Даніїл Раманаў з Жывуня, Уладзімір Чаур з Соснаў і іншыя.

Атрад імя К. Заслонава ўтварыўся ў кастрычніку 1943 г. Яго ўзначаліў **Маісей Сулім** – вопытны вайсковец, за плячыма якога былі і вызваленчы паход Чырвонай арміі ў Заходнія Украіну і Беларусь, і савецка-фінская вайна. Байцамі гэтага фарміравання народных мсціўцаў у большасці з'яўляліся таксама нашы землякі: Аляксандр Гуткоўскі, Васіль Гарбуновіч, Анатоль Бандарэнка, Васіль Лашч, Аляксандр Казакевіч, Іосіф Меснік, Міхаіл Тарасевіч, Віктар Зубовіч (быў шаўцом) і Уладзімір Кулеш з Жывуня, Дзмітрый Ясючэня з Падлуга і іншыя.

«Панфілаўцамі» (атрад стварылі ў кастрычніку 1943 г.) камандаваў Васіль Клімовіч. У гэтым фарміраванні народных мсціўцаў змагаліся з акупантамі ў асноўным жыхары Акцябрскага раёна.

У кастрычніку 1943 г. быў створаны і кавалерыйскі эскадрон імя Л. Даватара – унікальнае падраздзяленне. Арганізавалі яго на базе ўзвода коннай разведкі штаба партызанскага злучэння Мінскай вобласці. Пэўна, эскадрон такія ж функцыі і выконваў. Яно і зразумела.

**Камандаванню народных мсціўцаў заўсёды патрабаваліся свежыя і дакладныя звесткі пра змяненні ў вайсковых групоўках праціўніка, пра канцэнтрацыю жывой сілы і тэхнікі, наяўнасць рэзерваў і гарнізонаў, іх узбраенне, пра работу варожых камунікацый і характар грузаў, якія перавозяць фашысты, і пра многае іншае.**



Пераправа праз Арэсу, 1943 год.



Маісей СУЛІМ.



Цімафей ПУЧЫЛА.



Аркадзь МАЛЧАНАЎ.

Ды не толькі, так сказаць, для ўнутранага карыстання – каб разгадаць намеры фашыстаў у дачыненні да партызанскай зоны, а і для разведорганаў Чырвонай арміі.

Акрамя таго, коннікі – гэта тая мабільная сіла для нечаканых і імклівых удараў па ворагу, якая заўсёды была пад рукой. Таму ў эскадрон залічвалі самых адчайных, самых смелых і спрытных байцоў. Ну, і тых, хто ўмеў някепска трымацца ў сядле! Падбіралі нават з іншых атрадаў і брыгад. Так, напрыклад, Аляксандр Грыбаў са Стаўрапольшчыны да таго быў конным разведчыкам штаба брыгады №64 імя Валерыя Чкалава, Андрэй Ключэня з Касцяшоў і **Цімафей Пучыла** з Рачэні перайшлі з атрада імя Міхаіла Громава гэтай жа брыгады, Аляксандр Дарыенка і Пётр Шышко з Украіны – з атрада імя Дзмітрыя Гуляева брыгады №101 імя А. Неўскага, Мікалай Клімовіч з Чабусаў – з брыгады №100 імя С. Кірава, Канстанцін Дайнека са Старасека – з атрада імя Яўстрата Гарбачова брыгады №25 імя Панцеляймона Панамарэнкі.

І хлопцы сапраўды былі геройскімі! Канстанцін Дайнека, які займеў багаты баявы вопыт яшчэ ў час савецка-фінскай вайны, пачаў партызаніць з лютага 1942 г. Сярод «гарбачоўцаў» гэты кулямётчык вылучаўся і смеласцю, і мужнасцю. Удзельнічаў у разгроме нямецка-паліцэйскіх гарнізонаў у Ямінску, Кузьмічах, Пасталах, у шматлікіх засадах і дыверсіях на чыгунцы. Іосіф Баршчэўскі з Чэрвеньшчыны ваяваў у партызанскай кавалерыйскай брыгадзе імя Іосіфа Сталіна з кастрычніка 1942 г. Граміў фашыстаў і іх памагатых у вёсках Лапічы і Ліпень (Асіповіцкі раён), Талька (Пухавіцкі раён), Бярозаўка (Старобінскі раён), актыўна ўдзельнічаў у падрыве варожых эшалонаў і аўтамашын, у жорсткіх баях з карнікамі. Гэтак жа адважна змагаўся з акупантамі ў складзе «даватараўцаў». Татарын Мікалай Батыраў (родам з Уфімскай вобласці) летам 1943 г. трапіў у варожы палон. Але не скарыўся: здзейсніў дзёрзкі ўцёк і ўжо ў снежні таго ж года стаў байцом эскадрона.

Узначаліў эскрадрон Васіль Рагачоў (родам са Смаленшчыны). У лютым 1942 г. далучыўся да партызан: спачатку быў радавым байцом-разведчыкам, затым – камандзірам узвода коннай разведкі штаба партызанскага злучэння Мінскай вобласці, а ў верасні 1943 г. назначаны камандзірам кавалерыйскага эскадрона. Пасля ранення вясной 1944 г. яго адправілі самалётам у шпіталь за лінію фронту. А камандзірам эскадрона стаў **Аркадзь Малчанаў** (родам з Тамбоўшчыны). У жніўні 1942 г. ён кіраваў аддзяленнем разведкі партызанскага злучэння. Удзельнічаў у мностве баявых аперацый. Напрыклад, у разгроме варожага гарнізона ў вёсцы Ломавічы, падрыве чыгуначнага мосту праз Арэсу ля станцыі Вярхуціна. Камісарам у «даватараўцаў» быў наш, мясцовы, Антон Бахановіч з Юшкавічаў, палітрук запасу. Таксама шматвопытны ваяка, здольны арганізатар і прапагандыст.

Байцы эскадрона «маніторылі» сітуацыю і на Любаншчыне, і ў суседніх раёнах, наладжвалі зносіны з сувязнымі, бралі «языкоў». Праўда, пра нейкія канкрэтныя справы кавалерыстаў інфармацыі амаль няма. Вядома толькі, што яны ў чэрвені 1944 г. падчас злучэння народных мсціўцаў з часцямі Чырвонай арміі вялі баі з немцамі за пераправы праз раку Пціч.

За некалькі дзён да пачатку аперацыі «Баграціён» Беларускі штаб партызанскага руху на аснове звестак партызанскай разведкі накіраваў камандаванню 1 Беларускага фронта тэрміновае паведамленне пра тое, што 15 чэрвеня з Бабруйска ў раён Слуцка прыбыла варожая авіячасць, што мела да трохсот самалётаў, палова з якіх на наступны дзень узляцела, узяла курс на Баранавічы і не вярнулася. Астатнія размешчаны на аэрадромах у Амговічах (18 кіламетраў на паўночна-ўсходнім напрамку ад Слуцка) – 140 самалётаў, ва Урэччы – да дзесяці. На паўночнай ускраіне Урэчча замаскіраваны каля паўтысячы нямецкіх аўтамашын. Паведамлялася таксама пра тое, што праціўнік пашырае аэрадром у Набушава (13 кіламетраў на паўночна-ўсходнім напрамку ад Слуцка). Магчыма, дачыненне да згаданага паведамлення мелі і байцы кавалерыйскага эскадрона імя Л. Даватара.

**Сама ж партызанская брыгада імя А. Брагіна (дарэчы, яе штаб нейкі час размяшчаўся ў вёсцы Дварэц) за тэрмін існавання разграміла дзесяць нямецка-паліцэйскіх гарнізонаў, пусціла пад адхон 39 варожых эшалонаў, падбіла адзін танк, збіла адзін самалёт, падарвала 25 аўтамашын праціўніка і знішчыла каля чатырох тысяч гітлераўскіх салдат і афіцэраў.**

Ды і нямала іншай баявой работы выканала. Між тым на момант злучэння з часцямі Чырвонай арміі ў 121-й налічвалася ўсяго 527 партызанаў.

Як кажуць, малы залатнік, але дарагі!

**Сяргей КВІТКЕВІЧ, навуковы супрацоўнік Любанскага музея народнай славы.**